ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 29 (1027) ● ЧАЦВЕР, 25 кастрычніка 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выдаецца з 1935 г.

**ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ! НАСТОЙЛІВА АВАЛОДВАЙЦЕ МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКІМ ВУЧЭННЕМ, ДАСЯГНЕННЯМІ НАВУКІ, ТЭХНІКІ І КУЛЬТУРЫ! БУДЗЬЦЕ АКТЫЎНЫМІ БАРАЦЬБІТАМІ ЗА АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ РАШЭННЯЎ XXIV З'ЕЗДА КПСС!**

*(З Заклікаў ЦК КПСС да 56-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі).*

# ВЫХОЎВАЦЬ БУДАЎНІКОЎ КАМУНІЗМУ

## СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ Ў КАМСАМОЛЕ

У прыгожа ўбранай актавай зале сабраліся ў мінулы чацвер 305 супрацоўнікаў і студэнтаў фізічнага факультэта. Тут адбылася VIII справаздачна-выбарная камсамольская канферэнцыя. Абмеркаваны пытанні выканання рашэнняў XXIV з'езда КПСС, XVI з'езда ВЛКСМ і XXIV з'езда ЛКСМБ аб далейшым паляпшэнні ідэйна-выхаваўчай работы сярод моладзі і студэнтаў.

У прэзідыуме канферэнцыі — другі сакратар ЦК ЛКСМБ К. М. Платонаў, сакратар камітэта камсамола універсітэта А. Г. Слука, намеснік сакратара парткома БДУ В. І. Пракошын, дэкан фізічнага факультэта П. Зяцькоў, сакратар партбюро факультэта П. Л. Салаў, генерал-маёр у адстаўцы, Герой Савецкага Саюза А. В. Кірсанаў, студэнты і супрацоўнікі факультэта.

Са справаздачным дакладам аб рабоце камітэта камсамола выступіла сакратар камсамольскай арганізацыі факультэта Таццяна Працько.

— Галоўны напрамак ва ўсёй дзейнасці камсамольскай арганізацыі, — падкрэсліла Т. Працько, — развіццё творчасці студэнтаў, выхаванне будаўнікоў камунізму, падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў. Вось чаму асаблівае значэнне набывае стварэнне на факультэце атмасферы зацікаўленасці, узаемадапамогі, што садзейнічала б найбольш поўнаму раскрыццю здольнасцей студэнтаў.

Вялікую работу ў гэтым кірунку зрабіў акадэмічны сектар камітэта. Рэгулярна праводзіліся рэйды па праверцы наведвання заняткаў і паспяховасці, падрыхтоўкі студэнтаў да семінараў. Была арганізавана практычная дапамога першакурснікам.

Работа ідэалагічнага сектара была накіравана на выхаванне грамадска-палітычнай сталасці студэнтаў. У кожнай групе рэгулярна праводзіліся палітінфармацыі аб падзеях у краіне і за мяжой, лекцыі і сходы на тэмы: «Кожнаму камсамольцу, кожнай групе — ударную справу», «Як ты выконваеш даручэнні?», «Беларусь у брацкай сям'і народаў СССР» і іншыя.

У ходзе падрыхтоўкі да Ленінскага заліку, прысвечанага 50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна, ідэалагічны сектар распрацаваў прыкладны комплексны план удзельніка заліку, арганізаваў спаборніцтва на лепшую камсамольскую групу, пераможцай у якім стала І група ІІ курса.

Лепшым сектарам у камітэце камсамола быў шэфскі. Ва ўсіх 11 гарадскіх падшэфных школах былі арганізаваны фізічныя гурткі і факультатывы, афармляліся стэнды і кабінеты фізікі, у Станькаўскую школу-інтэрнат выязджала агітбрыгада, працаваў педатрад.

Затым Т. Працько расказала аб рабоце СНТ, арганізацыйнага, культмасавага, спартыўнага, інтэрнацыянальнага сектараў, сектара па арганізацыі работы ў інтэрнаце і штаба працоўных спраў.

Разам са станоўчым у рабоце камітэта камсамола былі сур'ёзныя ўпушчэнні: нізкае наведванне камсамольскіх сходаў, слабае выкарыстанне насценнага друку і «Камсамольскага пражэктара», дрэнная арганізацыя заняткаў у школе камсамольскага актыву і г. д.

У выступленнях многіх дэлегатаў гучала думка аб вялікім значэнні для студэнтаў навукова-даследчай работы. На факультэце створаны ўсе ўмовы для развіцця студэнцкай творчасці: дзейнічаюць гурткі, створаны студэнцкі вылічальны цэнтр і навукова-даследчая лабараторыя, праведзен лекторый «Асноўныя праблемы сучаснай фізікі», алімпіяда па фізіцы і матэматыцы.

За мінулы год членамі СНТ прачытана больш 300 дакладаў, 30 работ апублікавана, а работы студэнтаў Рагачова і Новікава ўдастоены медаляў. Дзейнасць СНТ адлюстроўвалася ў бюлетэні.

Цікавым было выступленне генерал-маёра ў адстаўцы, Героя Савецкага Саюза А. В. Кірсанава. Ён падкрэсліў, што сучасны спецыяліст павінен быць чалавекам шырокай эрудыцыі, глыбокіх ведаў, сапраўдным інтэлігентам. А таму проста недапушчальна, каб наш студэнт вучыўся на тройкі.

«Сапраўдным камсамольцам нельга стаць заўтра, ім трэба быць сёння» —вось асноўная думка выступлення М. Бялькова, студэнта III курса.

На канферэнцыі таксама выступілі загадчык кафедры ЗВЧ У. В. Ізох, студэнты Л. Шатон, А. Шарый, М. Місюк, М. Прохараў, Ю. Сакалоў, Н. Паўлоўская, В. Мачалаў і іншыя.

У заключэнне выступіў сакратар партбюро факультэта П. Л. Салаў. Ён заклікаў да навуковага падыходу ў камсамольскай рабоце, напомніў, што лозунг камсамольцаў 20-х гадоў—«Камсамол дае толькі адну прывілею — першым змагацца за рэвалюцыю»—не страціў сваёй злабадзённасці і сёння.

Дэлегаты канферэнцыі выбралі новы састаў камітэта камсамола з 23 чалавек, штаб «Камсамольскага пражэктара» і 122 дэлегаты на XXV справаздачна-выбарную камсамольскую канферэнцыю універсітэта.

У. ЛЯЛЕКА,
А. АСТРОЎСКІ.

## У ПРАФКОМЕ

**Адбылося пасяджэнне прафкома універсітэта, на якім абмеркавана работа вучэбна-вытворчай камісіі па паляпшэнню паспяховасці студэнтаў.**

**Прафком задаволіў просьбу М. М. Дразда аб вызваленні яго ад абавязкаў старшыні прафкома ў сувязі з паступленнем у аспірантуру.**

**Старшынёй прафкома выбран А. М. Жылінскі, намеснікам—Л. М. Маркоўская.**

## ЯШЧЭ АДНА КАФЕДРА

На гістфаку з мэтай сканцэнтравання прыкладных і дапаможных гістарычных дысцыплін і далейшага паляпшэння кіраўніцтва і арганізацыі вучэбнай і вытворчай практыкі студэнтаў створана кафедра археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін. Кафедры даручана чытанне лекцыйных курсаў і кіраўніцтва археалагічнай, этнаграфічнай, архіўнай і музейнай практыкай студэнтаў.

Да правядзення выбараў па конкурсу выконваючым абавязкі загадчыка кафедры назначан дацэнт Э. М. Загарульскі.

## *КАЛІ ЗАКАНЧВАЕЦЦА ПРАЦОЎНЫ ДЗЕНЬ?*

**Фотарэпартаж Д. Чаховіча з практычных заняткаў у студэнтаў IV курса вячэрняга аддзялення хімічнага факультэта глядзіце на другой старонцы.**



# 29 КАСТРЫЧНІКА — ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ КАМСАМОЛА

**Разам з усёй краінай рыхтуецца адзначыць Дзень нараджэння камсамола і моладзь нашага універсітэта. Сёння яна з гонарам можа рапартаваць аб поспехах у вучобе, спорце, мастацкай самадзейнасці, ударнай працы ў СБА і на калгасных палетках.**

## *ВІНШУЮЦЬ СЯБРЫ*

Горача віншуем камсамольскую арганізацыю універсітэта са святам—55-й гадавінай ВЛКСМ — баявога авангарду савецкай моладзі.

**Савет дружбы універсітэта.**

Мы, кубінскія студэнты, ад імя Саюза маладых камуністаў Кубы віншуем вас з 55-й гадавінай з дня нараджэння камсамола. Мы ўпэўнены, што ваша работа будзе яшчэ лепшай, што сувязі паміж нашымі арганізацыямі стануць яшчэ мацнейшымі. Жадаем вам ад імя СМКК вялікіх поспехаў.

**Камітэт СМК кубінскіх студэнтаў.**

Дарагія савецкія сябры! Балгарскія студэнты, якія вучацца ў БДУ, шчаслівыя віншаваць вас са светлым святам—55-й гадавінай з дня нараджэння слаўнага Ленінскага камсамола. Для нас, балгарскіх камсамольцаў, гэта свята з'яўляецца і нашым святам.

Роля ВЛКСМ, яго дзейнасць добра вядомы ў Балгарыі. Наша камсамольская арганізацыя вывучае вялікі вопыт ВЛКСМ і паспяхова яго ажыццяўляе.

Горача віншуем са святам, жадаем вам вялікіх поспехаў у рабоце, вучобе і далейшага ўмацавання брацкай дружбы паміж нашымі арганізацыямі.

**Камітэт ДКСМ балгарскіх студэнтаў.**



# ДА НОВЫХ РУБЯЖОЎ

— Адказная пара, перыяд найбольшай напружанасці ў працы, — так вызначаем мы час справаздач і выбараў у камсамоле.

Аналіз, роздумы, прывядзенне ўсёй сумы спраў і імкненняў камсамольскай арганізацыі да адной роўніцы, якая вызначаецца канкрэтным укладам у выкананне задач, пастаўленых перад камсамолам XXIV з'ездам КПСС, мабілізацыя новых сіл — усё гэта справаздачы і выбары, — так пачала свой даклад на справаздачна - выбарнай канферэнцыі філалагічнага факультэта сакратар камітэта камсамола Люда Агароднік.

Сапраўды, справаздачы і выбары — гэта не толькі падвядзенне вынікаў мінулай работы. Гэта і агляд рэзерваў, і абмеркаванне перспектыў росту, і пошукі новых форм работы.

Нягледзячы на значныя поспехі, якія былі дасягнуты ў вучэбна-выхаваўчай і ідэйна-палітычнай рабоце, у дакладзе сакратара і ў выступленнях дэлегатаў адчуваліся незаспакоенасць, імкненне весці работу на ўзроўні сучасных патрабаванняў. Паспяховасць студэнтаў у параўнанні з мінулым годам узрасла на 3,9 працэнта (95,8). Сярод факультэтаў БДУ філолагі занялі II месца, уступіўшы толькі гістфаку.

І разам з тым адзначаецца як трывожны факт і сур'ёзная недапрацоўка камітэта камсамола тое, што 31 камсамолец атрымаў у сесію нездавальняючыя адзнакі.

Адзначана ўзросшая навуковая актыўнасць студэнцтва, што знайшло сваё адлюстраванне ў дзейнасці СНТ факультэта. На рэспубліканскі агляд-конкурс былі прадстаўлены 82 навуковыя работы, 34 з іх аднесены да І катэгорыі.

Старшыня СНТ студэнтка V курса Таццяна Чайко, адзначаючы як станоўчы той факт, што філфак па агульнай колькасці работ знаходзіцца на першым месцы ва універсітэце, выказала шэраг крытычных заўваг: невысокі ўзровень некаторых работ, дрэнная прапаганда навуковай дзейнасці сярод першакурснікаў.

На канферэнцыі былі адзначаны вялікая работа па камуністычнаму выхаванню студэнтаў, тыя поспехі, якіх дабіліся студэнты ў галіне грамадска-палітычнай практыкі. За 1972-73 г. прачытана 432 лекцыі. У верасні гэтага года — 52 лекцыі. Сярод лепшых лектараў названы Т. Герко, Н. Курс, М. Прыгодзіч і іншыя. Студэнты выступілі ў вясковых школах рэспублікі ў час сельскагаспадарчых работ, у падшэфных школах г. Мінска, на Мінскім аўтазаводзе.

Член камітэта камсамола студэнтка IV курса Люба Аўраміч прысвяціла сваё выступленне развіццю мастацкай самадзейнасці, напомніла, што факультэт ужо трэці год запар займае першае месца ў агульнауніверсітэцкім аглядзе-конкурсе мастацкай самадзейнасці.

Вялікіх поспехаў дабіліся СБА факультэта. Студэнцкі будаўнічы атрад «Буравеснік-73» (камандзір Л. Агароднік) заняў першае месца ў Кастрычніцкім раёне Гомельскай вобласці, атрад «Верасок-73» (камандзір А. Надольская) — першае месца ў Барысаўскай зоне і Мінскай вобласці, атрад «Мара» (камандзір Л. Аўраміч) — першае месца ў Малдавіі сярод універсітэцкіх будаўнічых атрадаў.

Ваенна - патрыятычнае выхаванне — адно з вядучых звенняў у рабоце камітэта камсамола. У пачатку года камітэт камсамола арганізаваў вучобу ваенна-патрыятычнага сектара, актыву ДТСААФ. Гэта зрабіла добры ўплыў на работу сектара. Паспяхова прайшоў месячнік абаронна-масавай работы. Было арганізавана наведанне мемарыяльнага комплексу «Хатынь», Кургана Славы, музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Работа інтэрнацыянальнага сектара вялася ў асноўным па двух напрамках: работа гідаў-перакладчыкаў у таварыстве «Спадарожнік», інтэрработа на факультэце. Праводзілася яна ў розных формах. Вечары-сустрэчы са студэнтамі з Конга, В'етнама, Бангладэш, ГДР і Балгарыі, палітінфармацыі па тэме «Юнацтва выкрывае імперыялізм», прыём гасцей-студэнтаў з ГДР і Польшчы — вось некаторыя з тых карысных і цікавых спраў. Ацэньваючы работу канферэнцыі, належыць адзначыць, што яна сапраўды з'явілася падвядзеннем вынікаў і аглядам сіл. Камсамольскі актыў наметціў перспектывы развіцця і росту арганізацыі з улікам тых крытычных заўваг, якія былі выказаны ў адрас камітэта камсамола. І хочацца верыць, што камсамольская арганізацыя філфака дасягне тых рубяжоў, якія намеціла канферэнцыя.

А. ГІРУЦКІ.

Матэрыялы са справаздачна-выбарных сходаў падрыхтаваны прэс-цэнтрам камітэта камсамола.

# ПЕРАСТУПІЦЬ ПАРОГ АБЫЯКАВАСЦІ

**Усім добра вядома ісціна: не памыляецца той, хто не працуе. Пасля справаздачна-выбарнага сходу біялагічнага факультэта я сказала б так: памылкі здараюцца часцей за ўсё там, дзе гаспадарыць абыякавасць, дзе жывая думка сутыкаецца з пасіўнасцю, нежаданнем узяцца за справу. Чаму я прыйшла да гэтай думкі? У якасці адказу прапаную некалькі эпізадычных момантаў са сходу.**

**Грамадскія куратары**

Згадзіцеся, некалькі нязвыклае словазлучэнне: а «бацькамі» яго сталі студэнты біяфака. Але ўсё па парадку.

Вядома, што згуртаванасць, ініцыятыўнасць калектыву ў многім залежаць ад папаўнення студэнцкіх радоў, карацей кажучы, ад першакурснікаў, ад таго, як хутка яны ўвойдуць у рытм студэнцкага жыцця. Дапамагаюць жа ім у гэтым старэйшыя таварышы. Найбольш ініцыятыўныя падтрымліваюць з групамі пастаянную сувязь, знаёмяць з універсітэтам, даюць выпрабаваныя жыццём парады па вядзенню канспектаў, карыстанню падручнікамі, працамі класікаў марксізму-ленінізму і нават... як здаваць экзамены. Яны заўсёды ў групе, жывуць яе інтарэсамі, справамі, задумамі. Вось іх і называюць біёлагі грамадскімі куратарамі. Па сутнасці справа не ў назве, а ў той новай цікавай форме работы з першакурснікамі, якую прапанавалі члены акадэмічнага сектара камітэта камсамола. Але гэтая карысная справа не атрымала масавага распаўсюджання. Часткова з-за таго, што пачынанне новае, але, бадай, і з-за таго, што ініцыятыва членаў акадэмічнага сектара сутыкнулася з абыякавасцю камсамольцаў - старшакурснікаў.

Быў жывы струмень у рабоце камітэта камсамола? Так! Было імкненне працаваць творча? Так!

І ўсё ж...

**Ці заўсёды маўчанне — золата!**

«Камсамольскі пражэктар» свеціць на кожным факультэце. І калі выходзіць новы нумар, ля яго заўжды тоўпяцца студэнты. Любяць «КП» і на біяфаку. Л. Юшчанка расказвае аб нялёгкай працы рэдкалегіі, аб праверках, якія праводзяцца рэйдавымі брыгадамі «КП», аб лепшых памочніках — спецкорах курсаў. Гэтая цесная сувязь дапамагае своечасова высвятляць недахопы, рабіць нумар баявым, цікавым, вострым.

Але... зноў мы сутыкаемся з абыякавасцю. На вострыя сігналы «КП» камсамольскія групы не рэагавалі. Гэтае нежаданне «вынесці смецце з хаты», абмеркаваць крытычны матэрыял у групе, прыняць меры да выкаранення памылак, гэтае абыякавае маўчанне згладжвала ўсю работу «Камсамольскага пражэктара». Напэўна, камсоргі груп прытрымліваліся думкі, што маўчанне — золата.

**Даследаваць — азначае адкрываць!**

На трыбуне загадчык кафедры заалогіі пазваночных прафесар І. К. Лапацін. Выступленне яго сціслае, але перадае самую сутнасць справы. Прапанову стварыць штаб па ахове прыроды камсамольцы падтрымалі аднадушна. Тым больш, што ў задачах штаба не толькі інспектарская праца, але і даследчыя пошукі. Штаб возьме шэфства над зялёнай зонай сталіцы. У выніку ўсебаковага яе вывучэння студэнты змогуць выпрацаваць свае прапановы па выкарыстанню зялёнага багацця. Гэта і выклікае ў студэнтаў-біёлагаў вялікую зацікаўленасць, бо даследаваць — азначае адкрываць!

Галоўнае цяпер — прыняць у гэтай справе самы актыўны ўдзел кожнаму, галоўнае — пераступіць парог абыякавасці.

...Закончыўся камсамольскі сход. Выбран новы састаў камітэта камсамола на чале з Уладзімірам Курчанкам. Хочацца пажадаць камсамольцам біяфака большай ініцыятыўнасці, жывой думкі, натхнення.

Т. СКІБІЦКАЯ.

**СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ Ў КАМСАМОЛЕ**

# НЕ ПАЎТАРЫЦЬ ПАМЫЛАК

Аб вучобе, грамадскім, навуковым, спартыўным жыцці студэнтаў далажыў справаздачна - выбарнаму сходу геафака сакратар камітэта камсамола Віктар Раманаў. Ён аналізуе вынікі зімовай і летняй сесіі. Сярэдні бал па факультэту ў 1972-73 навучальным годзе склаў 3,93 бала. У параўнанні з мінулым навучальным годам ён некалькі знізіўся. Паспяховасць галоўным чынам звязана з колькасцю прапушчаных вучэбных гадзін, а іх набегла—2243. На жаль, вучэбная камісія толькі канстатавала факты пропускаў заняткаў, а канкрэтныя меры не прымаліся. Не было таго цеснага кантакту камітэта з групавымі бюро, якога хацелася б дабіцца. Недастаткова актыўна дзейнічаў «Камсамольскі пражэктар». Прыйшлося нават вынесці вымову начальніку штаба «КП» С. Смірнову.

У станоўчым плане гаварылася аб тым, што абагульнен і пашыран вопыт работы лепшых груп факультэта. Наладжана дастаўка перыядычнага друку ў інтэрнаты. Добра пастаўлена мастацкая самадзейнасць.

Адзін за адным слова бяруць члены камітэта камсамола. В. Антановіч, адказная за культмасавы сектар, расказала аб тым каштоўным, што зроблена на курсах, у прыватнасці на IV і V. Ядро мастацкай самадзейнасці факультэта — яго агітбрыгада. Неаднаразова студэнты выязджалі з канцэртамі ў калгас «Перамога» Валожынскага раёна, выступалі ў інтэрнатах № 5 і № 7. Яны былі ўдзельнікамі вечара, прысвечанага Міжнароднаму дню студэнтаў, які адбыўся ў інстытуце замежных моў. Вакальна-інструментальны ансамбль «Пілігрымы» набыў вядомасць і ва ўсім універсітэце. Яго члены прынялі ўдзел у агітпрабегу, прысвечаным 50-годдзю Саюза ССР.

Выступіўшыя падвялі вынікі грамадскай і спартыўнай работы факультэта за год.

Самакрытычна падышоў да ацэнкі сваёй работы начальнік штаба КП: указаў на недахопы і пажадаў новаму саставу КП не паўтараць памылак мінулага года.

З цікавасцю выслухалі прысутныя выступленні студэнтаў Л. Грынкевіча, А. Шулака, А. Крэйміна і выкладчыкаў Л. В. Гілевіч, В. В. Бародкіна, А. Я. Шкляра, Г. Я. Рылюка, Н. П. Хрыпко.

Выбран новы састаў камітэта. Сакратаром выбран студэнт II курса Сяргей Субоцін.

Н. НОВІКАВА.





# КАЛІ ЗАКАНЧВАЕЦЦА ПРАЦОЎНЫ ДЗЕНЬ?





**Для іх, вячэрнікаў, не ў шэсць і нават не ў восем гадзін. Скончыўшы работу ў сваіх лабараторыях, ва ўстановах ці на заводах, яны становяцца студэнтамі... Надзеты белыя халаты, і адразу адыходзяць у бок дзённыя клопаты. Наперадзе — шмат цікавага. Пакрысе адкрывае ім хімія свае таямніцы.**

**Сёння ў чацвёртакурснікаў заняткі па фізхіміі вядзе асістэнт Тамара Іванаўна ТАРГОНСКАЯ.**

Фота Д. Чаховіча.

## У ВНУ КРАІНЫ

# ЁСЦЬ ДРУГІ!

Адной з актуальных задач сучаснасці з'яўляюцца даследаванні касмічных промняў і міжпланетнай прасторы. Цяжка прадбачыць у поўнай меры, да чаго прывядзе раскрыццё таямніц космасу. А пакуль — работа, работа, работа.

Пры кафедры эксперыментальнай фізікі Кабардзіна-Балкарскага універсітэта з гэтай мэтай ствараецца комплекс, які складаецца з пяці суперманітораў, устаноўленых на розных узроўнях.

У мінулым годзе на навуковай базе КБДУ ў пасёлку Эльбрус уступіў у дзеянне і паспяхова працуе першы суперманітор. А вось нядаўна адбыўся пуск другога— на ўзроўні Нальчыка.

Цяпер заканчваецца наладка трэцяга манітора на піку Чэгет. У бліжэйшы час пачнуцца падрыхтоўчыя работы для ўстанаўлення чацвёртай чаргі—на прытулку Адзінаццаці і апошняй, пятай, на седлавіне Эльбруса.

(«Университетская жизнь», г. Нальчик).





**Прачытаеш свежы нумар насценнай газеты факультэта — і зробіш захапляючае падарожжа, пазнаёмішся з цікавымі людзьмі, даведаешся пра хвалюючыя студэнцкія падзеі. А каб выйшаў гэты нумар, колькі даводзіцца папрацаваць студэнцкім карэспандэнтам, усяму актыву газеты!**

**НА ЗДЫМКУ: рэдкалегія насценгазеты «Савецкі юрыст» на чале з рэдактарам М. Бародкам рыхтуе чарговы нумар.**

Фота **Д. Чаховіча.**

*Запрашаем да размовы*

# ЦІ СВЕЦІЦЬ ПРЫГАЖОСЦЬ УСІМ

### НЕКАТОРЫЯ РАЗВАЖАННІ НАКОНТ НОВАГА БОКУ СТАРОЙ ПРАБЛЕМЫ

ПРАБЛЕМА «фізікаў і лірыкаў» — спрэчка дзесяцігадовай даўнасці. Грамадская думка даўно схілілася да таго, што нават вельмі вузкая спецыялізацыя не павінна перашкаджаць развіццю кругагляду чалавека. І гэта ўжо не з'яўляецца прадметам для сутыкненняў. Але...

Неяк мне давялося пабываць на экзамене па навуковаму камунізму ў студэнтаў IV курса факультэта прыкладной матэматыкі. У якасці дадатковых студэнты атрымлівалі пытанні па літаратуры, кіно, жывапісу... Адказы на іх і штурхнулі на разважанні аб тым, ці ўмеем мы бачыць прыгожае, адабраць у ім патрэбнае для сябе, наогул, аб тым, што складае паняцце інтэлігентнасць. Размова здаецца тым больш патрэбнай, што ў вну прыйшло новае папаўненне.

Зараз многа гавораць на тэму, якім павінен быць сучасны спецыяліст. І амаль усе аднадушны: акрамя ведаў у галіне пэўнай навукі, яму неабходна валодаць высокай культурай, быць інтэлігентам.

— Якую кнігу прачыталі вы ў апошні час?

Гэта пытанне гучала часцей іншых. І толькі чатыры чалавекі змаглі адказаць на яго. Іра А., напрыклад, упершыню знаёміцца з «Ціхім Донам» Шолахава, Алена К. —з «Братамі Карамазавымі» Дастаеўскага. І, наогул, як сказала яна сама, чытае «па адной кнізе ў год для асабістага задавальнення». Павісалі ў паветры пытанні аб тым, што ім вядома пра Паустоўскага, ці чыталі Экзюперы і Хемінгуэя. Паэты? Пра сучасных хто-ніхто ведае. Ну а класікі? «Чытала Пушкіна і Лермантава. Мы іх у школе праходзілі»,—адказвае Люда Г.

Праходзілі... Адкуль узялося, як трапіла да нас гэтае слова? У тлумачальным слоўніку яно раскрываецца як — **прайсці міма чагосьці.** Вось так і праходзяць некаторыя міма Шолахава, Талстога, міма сучаснай літаратуры. Праходзяць, не ўзяўшы для сябе нічога, пагартаўшы крыху школьны падручнік літаратуры.

Праходзяць, але не ўсе. І тыя, хто спыняецца, абагачаюць сваё жыццё, расшыраюць сваё разуменне свету, робяць для сябе шмат цікавых і прыемных адкрыццяў.

І ўжо не віна дзяўчат, будучых матэматыкаў, а бяда, што не навучылі іх ні ў школе, ні дома, ні ў вну чэрпаць усё разумнае і прыгожае з культуры папярэдніх пакаленняў. Таму няхай сабе тысячы аркестраў будуць выконваць цудоўную музыку, сотні тэатраў будуць ставіць добрыя спектаклі—яны пройдуць міма. У такіх выпадках і паяўляецца гэта мяшчанскае «для асабістага задавальнення», а потым: гэта модна, значыць, трэба пачытаць, аб гэтым гавораць — трэба паглядзець, нельга дастаць білеты на «Індыйскіх ёгаў» — хоць тры дні пастаю ў чарзе, але пагляджу, хіба ж я горшы за іншых?

Цудоўны пісьменнік Міхаіл Прышвін гаварыў некалі: «Прыгажосць свеціць усім, але не кожнаму: не кожны здольны сустрэць яе». Няўменне выбраць патрэбнае і важнае з мора акружаючых нас твораў літаратуры і мастацтва прыводзіць да таго, што гасне для іншых сапраўдная прыгажосць. Так здарылася і з нашымі дзяўчатамі. Усе яны паглядзелі, напрыклад, фільмы «Гоншчыкі» і «Іспанкі ў Парыжы». Але ні адна нават і не падумала пайсці на «Палаючы кантынент», жывую, дынамічную, маляўнічую стужку Р. Кармэна, фільм, які, акрамя прыгажосці, нясе вялікую і цікавую інфармацыю.

Мне могуць запярэчыць: перш чым знайсці зерне, трэба зняць шалупінне, перш чым убачыць сапраўдную каштоўнасць, трэба паглядзець сотні падробак. Гэта так, але калі працэс «зняцця» зацягваецца надоўга, ці не застанемся мы зусім «ля разбітага карыта?»

Ёсць у нашай праблеме і другі бок, які больш за ўсё звязан з катэгорыяй «інтэлігентнасць». Разам з уменнем бачыць прыгожае часта не хапае сілы прывесці атрыманую інфармацыю ў сістэму, якая і складае культурны багаж кожнага чалавека. Тут, вядома, вялікая роля адводзіцца эстэтычнаму выхаванню ў школе, вну, але галоўнае—асабістая зацікаўленасць чалавека.

Адна мая знаёмая, дарэчы, таксама з ФПМ, паскардзілася неяк, што ёй сумна са сваімі сяброўкамі.

— Ведаеш, — расказвала яна,—усе мы ўлюбёны ў матэматыку. Разам сядзім на лекцыях, у чытальных залах, разам ходзім у кіно і тэатры. Але калі пасля спектакля я спрабую выклікаць сябровак на спрэчку—адмахваюцца: ат, паглядзелі і добра.

З Зінай К. мы гутарылі пра тэатр.

— Што я глядзела ў апошні час? Прэм'еру ў рускім тэатры. Не памятаю назву. Нейкага амерыканскага пісьменніка.

Вось такая абыякавасць, нецікаўнасць прыводзіць да камічнага: савецкі журналіст Генрых Баравік ператвараецца ў «нейкага амерыканскага пісьменніка», у Беларускім тэатры імя Янкі Купалы «паяўляецца» Ала Тарасава, а Рэпін, Левітан і Васняцоў называюцца мастакамі, «што былі раней».

Мне шмат даводзілася бываць на камсамольскіх сходах у групах і на курсах. На іх нярэдка абмяркоўвалася пытанне: што такое сапраўдная камсамольская справа? І не раз чуліся воклічы аб тым, што культпаходы ў кіно, тэатры, музеі—справа асабіста кожнага, а не нейкае там агульнае «мерапрыемства». Доля праўды ў гэтым, вядома, ёсць. Але ж часцей такія вось «мерапрыемствы» нараджаюць любоў да прыгожага, а дыспуты і спрэчкі прывучаюць адносіцца да кожнага твора мастацтва крытычна, прывучаюць аналізаваць, разважаць.

Тым, хто вучыцца ў Мінску, пашчасціла: яны жывуць у вялікім культурным цэнтры. І як шкада, што не змаглі некаторыя з іх узяць з гэтага найвялікшую карысць. І не толькі для сябе, а і для людзей, з якімі прыйдзецца працаваць, атрымаўшы дыплом спецыяліста.

Шмат ведаць, умець, як гаварыў К. Паустоўскі, шукаць вакол сябе паэзію і дзяліцца набытым багаццем з іншымі — ці не ў гэтым вышэйшая культура чалавека! Але як прыйсці да яе, як стварыць гэтую гармонію? І як пазбавіцца ад неабходнасці задаваць сябе пытанне, чаму такімі рознымі пакідаем мы студэнцкую аўдыторыю: адны—высокакультурнымі людзьмі, іншыя...

Л. ПЕРАСЫПКІНА.

**АД РЭДАКЦЫІ:**

**Публікуючы сёння артыкул Л. Перасыпкінай, рэдакцыя спадзяецца, што чытачы газеты адгукнуцца на ўзнятыя пытанні і выкажуць свае меркаванні, прапановы, прывядуць свае прыклады.**

**Раскажыце, як вы выкарыстоўваеце багацці культуры, літаратуры, мастацтва, як фарміруеце сваю асобу. Успомніце пра сваіх сяброў, знаёмых.**

**Вядома, і сярод матэматыкаў, фізікаў, прадстаўнікоў іншых прыродазнаўчых спецыяльнасцей ёсць вельмі цікавыя, шматгранныя натуры, а сярод філолагаў ці гісторыкаў можна сустрэць даволі абмежаваных людзей. Дык запрашаем да размовы!**

# УСЁ ШЫРЭЙ КОЛА СЯБРОЎ

Шмат сяброў у студэнтаў нашага універсітэта. Яны ёсць у Каўнасе і Ленінградзе, у Казані і Кіеве. у Маскве і Рызе. Перапіска, удзел у навуковых канферэнцыях універсітэтаў - сяброў, сумесны адпачынак у спартыўна - аздараўленчых лагерах, абмен мастацкімі калектывамі робяць гэтую дружбу цікавай і моцнай. А нядаўна руку на дружбу працягнуў нам Ерэванскі універсітэт. У прафком БДУ прыйшло пісьмо, у якім камітэт па знешніх сувязях пры прафкоме Ерэванскага універсітэта прапануе абмен калектывамі мастацкай самадзейнасці і пуцёўкамі ў спартыўна-аздараўленчыя лагеры.

З Ерэвана паведамляюць: «Кожны год вясной у нас праводзіцца традыцыйнае свята «Студэнцкая вясна». Нам хацелася б запрасіць вашых удзельнікаў мастацкай самадзейнасці на наш фестываль».

У адрас прафкома Ерэванскага універсітэта адпраўлена пісьмо з БДУ. Беларускія студэнты згодны замацаваць знаёмства.

І. СЦЯПУРА.
(Карпункт прафкома).

# ВЕЛЬМІ ВАЖНАЯ НАВУКА—МАТЭМАТЫКА

Што яны дагэтуль ведалі пра геаметрыю? Што гэта грэчаскае слова, якое азначае «мераць зямлю». Што асабліва многа ў справе развіцця геаметрыі зрабіў грэчаскі вучоны-матэматык Еўклід. Распрацаваную ім навуку ён выклаў у трынаццаці кнігах, якія назваў «Пачаткі». На іх аснове і складзены сучасныя школьныя падручнікі.

А сёння яны раптам даведаліся, што ёсць і іншая геаметрыя, больш дакладная і вельмі цікавая. Геаметрыя, якой карыстаюцца пры запуску касмічных караблёў. Што з усіх геаметрычных паняццяў самае складанае—лінія, а найбольш простае—мноства.

Яны—гэта хлопчыкі і дзяўчынкі з розных школ горада—навучэнцы школы юных матэматыкаў пры БДУ.

Для іх усё тут незвычайна: і вялікая аўдыторыя, і тое, што не выклікаюць да дошкі, каб паставіць адзнаку. І сядзяць яны прыціхшыя і крыху ўрачыстыя.

Ідуць першыя заняткі. А ў падарожжа па краіне матэматыкі вучняў вядзе дацэнт кафедры агульнай матэматыкі А. С. Фядэнка. Паяўляюцца на дошцы чарцяжы і формулы, даты і лічбы.

Уважліва слухаюць першую ў сваім жыцці лекцыю па матэматыцы сяброўкі-дзевяцікласніцы са школы № 9 Іра Хрэнава і Таня Пpановіч. Як хочацца ім больш ведаць!

Віта Мядзведзева — таксама дзевяцікласніца са школы № 4. Дзяўчынка марыць працаваць, як бацька, у галіне эканамічнай кібернетыкі. Таму і прыйшла сюды. Наташа Карцэвіч, Іра Лукаш і Галя Дзікатава вучацца ў дзесятым класе школы № 64. Ужо зусім блізка час, калі прыйдзецца выбіраць далейшы шлях. Наташа і Галя мараць паступіць у політэхнічны інстытут, Іра—на матфак БДУ. Матэматыка для іх—не проста прадмет, а —любімы. Дзяўчынкі ўжо некалькі год наведваюць школьны факультатыў. А ў гэтым годзе даведаліся, што ў БДУ існуе школа...

Падыходзіць к канцу лекцыя. Анатоль Сямёнавіч адказвае на апошнія пытанні. Цяпер кожную сераду рабяты будуць прыходзіць сюды, каб стаць на нейкі час не толькі вучнямі, а і слухачамі матэматычнай школы.

Цяпер жа яны пакідаюць 606-ю аўдыторыю вельмі ўзрушаныя, не асэнсаваўшы, мабыць, яшчэ ўсяго пачутага...

Л. ЛІДЗІНА.

